УДК 378 (06)

## ДЫСТАНЦЫЙНАЯ АДУКАЦЫЯ ЯК ДЭГУМАНІЗАЦЫЯ

**В.П. Галубовіч, В.У. Галубовіч**
УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт" (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. У артыкуле акцэнтуецца ўвага на негатыўных наступствах выкарыстання сучасных тэхналогій у адукацыйным працэсе.
Ключавыя словы: адукацыя, дыстанцыйная адукацыя, дэгуманізацыя.

## ДИСТАНЦИОННОЕ ОБРАЗОВАНИЕ КАК ДЕГУМАНИЗАЦИЯ

**О.П. Голубович, В.В. Голубович**
УО "Гродненский государственный аграрный университет" (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Аннотация. В статье акцентируется внимание на негативных последствиях использования современных технологий в образовательном процессе.
Ключевые слова: образование, дистанционное образование, дегуманизация.

## DISTANCE EDUCATION AS DEHUMANIZATION

**V.P. Halubovich, V.U. Halubovich**
EI "Grodno State Agrarian University" (Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The article focuses on the negative consequences of modern technologies use in an educational process.
Key words: education, distance education, dehumanization.

У сучасным глабальным свеце традыцыйныя адукацыйныя ўстановы паступова страчваюць свой аўтарытэт ва ўмовах уседаступнасці ведаў і метадалогіі іх атрымання. Знакамітыя і паспяховыя сучаснікі прама дэкларуюць, што традыцыйная школа, у тым ліку вышэйшая, не адпавядае запатрабаванням часу і не ўключана ў вытворчы працэс [1]. Сапраўды, сучасныя гаджэты праз свае тэхнічныя магчымасці карыстацца разнастайным кантэнтам здаюцца больш карыснымі і інструментальнымі, чым прысутнасць у аўдыторыі і руцінны рух па адпрацаваных планах заняткаў. Але ў сённяшніх умовах нават на лекцыях гаджэты становяцца не столькі альтэрнатывай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

атрыманню ведаў, колькі канкурэнтнай формай правядзення часу, якая адцягвае ўвагу студэнтаў ад працы ў аўдыторыі. Жыццё ў іншай рэальнасці набывае большую каштоўнасць, чым рэальнасць і магчымасць у будучым жыць лепш менавіта у гэтай рэальнасці.

Вышэйшыя навучальныя ўстановы імкнуцца адказваць на выклікі часу і змяняцца, кампенсаваць відавочныя недахопы, у тым ліку праз выкарыстанне сучасных тэхналогій. Адной з форм іх выкарыстання з'яўляецца дыстанцыйная адукацыя, ці навучанне [2], якая ў пэўных умовах можа быць карыснай і нават незаменнай (напрыклад, ва ўмовах пандэміі, якая ахапіла планету ў 2020 г.), але цалкам выключыць жывы кантакт з выкладчыкам не зможа.

У працэсе выкладання розныя аспекты адыгрываюць сваю ролю, у тым ліку асабістыя манеры і паводзіны выкладчыка, які інтуітыўна больш камунікуе з той часткай аўдыторыі, якая выяўляе цікавасць і адэкватна рэагуе на матэрыял. Праца са студэнтамі –працэс перадачы не толькі пэўнага аб'ёму ведаў, але і акадэмічнай культуры, гэта выхаваўчы ў шырокім сэнсе працэс, дзе менавіта чалавек, а не размытая карцінка на экране камп'ютэра, з'яўляецца галоўным медыятарам гуманітарных каштоўнасцей.

Дыстанцыйная адукацыя, калі яе разглядаць як адзіную альтэрнатыву традыцыйнаму выкладанню, – гэта рашучы крок да замены чалавека робатам. Рана ці позна, але гэта наступіць, калі не расстаўляць прыярытэты правільна. Складана сабе ўявіць аўдыторыю, дзе б заняткі праводзілі машыны, як саму арганізацыю гэтага працэсу. Прафесія выкладчыка таксама стане незапатрабаванай, але людзі, выкладаючы, спрабуюць, у першую чаргу, падрыхтаваць да жыцця і выхаваць, атрымаць чалавека. Машына выхавае машыну. Студэнт, які спадзяецца, што ў аўдыторыі пры адсутнасці прафесара ён зможа дасыпаць на апошняй парце, будзе выяўлены аўтаматычна.

Выкладчык вышэйшай школы, у першую чаргу, – вучоны, які стварае ўласны прадукт і аўру, ён працуе на канкрэтны вынік. Тэхналогія, у тым ліку дыстанцыйная, – інструмент трансляцыі гэтага прадукту, інструмент, які звужае адукацыйны працэс да непасрэднай камунікацыі паміж "аўтарам" і "чытачом", пры гэтым сама адукацыйная сістэма становіцца фактычна непатрэбнай.

Дыстанцыйную адукацыю можна разглядаць як рэакцыю на пэўныя страхі традыцыйнай адукацыі, яе жаданне адпавядаць сучасным тэхналогіям, якія з'яўляюцца толькі дапаможнымі сродкамі выхавання. Працэс камунікацыі складаны, але ён патрэбны студэнту не толькі як сродак засваення неабходнай інфармацыі для прафесійнай дзейнасці ў вузкім сэнсе. Дыстанцыйная адукацыя можа быць толькі часткай,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

фрагментам падрыхтоўкі спецыяліста ў той ці іншай галіне. Недахопам адукацыі такога тыпу з’яўляецца відавочная складанасць працэдуры верыфікацыі персанальнага ўдзелу студэнта ў выкананні задання і кантроль засваення неабходнага аб’ёму інфармацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. www.adme.ru
2. Крывой, Я. Дыстанцыйная адукацыя ў Беларусі: стан, праблемы і перспектывы [Электронный ресурс]. - http://belarusdigest.com/papers/distans-education-by.pdf. Дата доступа: 22.03.2020.

УДК 378.017:378.091

## ВЛИЯНИЕ ЦЕННОСТНЫХ ОРИЕНТАЦИЙ СТУДЕНТОВ НА СОВЕРШЕНСТВОВАНИЕ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА

**А.В. Грибов, Л.А. Язубец**
УО «Гродненский государственный аграрный университет» (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ekf@ggau.by)

Аннотация. Различные формы обучения непосредственно влияют на качество подготовки будущих специалистов, однако для эффективного их использования необходимо выявить ценностные ориентации обучающихся. В данной статье проведен анализ некоторых ценностных ориентаций студентов-выпускников экономического факультета заочной формы обучения УО «Гродненский государственный аграрный университет».
Ключевые слова: ценностные ориентации, анкетирование, образовательный процесс.

## INFLUENCE OF VALUABLE ORIENTATIONS OF STUDENTS ON THE IMPROVEMENT OF THE EDUCATIONAL PROCESS

**A.V. Gribov, L.A. Jazubets**
EI «Grodno State Agrarian University» (Republic of Belarus, 230008, Grodno, 28 Tereshkova st.; e-mail: ekf@ggau.by)

Summary. Various forms of training directly affect the quality of training of future specialists, however, for their effective use it is necessary to identify the value orientations of students. This article analyzes some value orientations of graduate students of the Faculty of Economics of the correspondence course of study at the public educational institution Grodno State Agrarian University.
Key words: value orientations, questioning, educational process.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ